# Сапраўдны Крапіва ў мастацкім агародзе

***Сёлетні год багаты на юбілеі ў нацыянальнай літаратуры. Сярод іх - вядомы пісьменнік Кандрат Крапіва, якому нядаўна споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння.***

Хаця ў аснове літаратурнай творчасці класіка ляжыць гумар, Кандрат Кандратавіч прайшоў досыць нялёгкі 95-гадовы шлях. З маленства ён вельмі шмат працаваў і зусім маладым хлопцам перайшоўжыць на свой хлеб. Кандрат Крапіва жыў з навукі, працаваў словам не толькі ў мірны час, але і пад час пераҗытых ім войнаў. Яркай старонкай у гісторыі літаратуры з'яўляецца яго драматургія. Вельмі ўстойлівай перад няўмольным судом часу аказалася драма «Партызаны». У 1937 годзе п'еса была пастаўленая спачатку на сцэне Барысаўскага, а потым Мазырскага калгасна-саўгаснага тэатраў.

З нагоды юбілею Кандрата Крапівы ў Мазырскай цэнтральнай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна ў рамках дэкады беларускай і краязнаўчай кнігі «Мову родную, край свой любіце!» прайшлі літаратурны эцюд «З прывітаннем... Дзед Кандрат!» і свята байкі «Зброяй сатыры, зброяй праўды». Цягам яе побач з кніжнай выстаўкай «Нястомны працаўнік» (яна прадэманстравала жанравую разнастайнасць пісьменніка) праводзіліся агляды яго твораў. На свята байкі былі запрошаныя мазырскія аматары паэзіі Валянціна Нікіціна, Вольга Андрусевіч, Аляксандра Бараноўская, якія з натхненнем і выразнасцю дэкламавалі байкі Крапівы. Ветэран бібліятэчнай справы В. Нікіціна напісала верш, які прысвяціла юбіляру. Вучні сярэдняй школы № 1 паказалі свае акцёрскія таленты ў інсцэніроўках паводле баек творцы. Падчас свята ў зале ўсталявалася атмасфера цеплыні і адзінства пакаленняў.

*Ніна РАГОЗЕНКА, загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Мазырскай цэнтральнай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна*



Рагозенка, Н. Сапраўдны Крапіва ў мастацкім агародзе / Ніна Рагозенка // Краязнаўчая газета. – 2016. - № 1. – С. 2.